# НЯХАЙ ЖЫВЕ ПЕРШАЕ МАЯ!

С.С.С.Р.
В. И. ЛЕНИНА

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 35 (7112) | Панядзелак, 1—2 мая 1944 г. | Цана 20 кап.

*Няхай жыве Ўсесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў, партыя Леніна—Сталіна — натхніцель і арганізатар барацьбы за перамогу над нямецка-фашысцкімі захватчыкамі!*

## ЗАГАД

## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

**1 мая 1944 г. № 70 гор. Масква**

Таварышы чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, сержанты, афіцэры і генералы, партызаны і партызанкі! Працоўныя Совецкага Саюза! Браты і сёстры, часова падпаўшыя пад іга нямецкіх прыгнятальнікаў і сілком угнаныя на фашысцкую катаргу ў Германію!

Ад імені Совецкага Ўрада і нашай большэвіцкай партыі вітаю і віншую Вас з днём 1 Мая!

Народы нашай краіны сустракаюць дзень 1 Мая ў абстаноўцы выдатных поспехаў Чырвонай Арміі.

З часу разгрому нямецкіх дывізій пад Сталінградам Чырвоная Армія вядзе амаль няспыннае наступленне. За гэты час Чырвоная Армія прайшла з баямі ад Волгі да Сэрэта, ад прадгор'яў Каўказа да Карпат, знішчаючы варожую нечысць і вымятаючы яе з совецкай зямлі.

У ходзе зімовай кампаніі 1943-44 гг. Чырвоная Армія выйграла гістарычную бітву за Днепр і Правабярэжную Украіну, сакрушыла магутныя абараніцельныя ўмацаванні немцаў пад Ленінградам і ў Крыму, умелымі і імклівымі дзеяннямі перадолела нямецкую абарону на водных рубяжах—Паўднёвы Буг, Днестр, Прут, Сэрэт. Амаль уся Украіна, Малдавія, Крым, Ленінградская і Калінінская вобласці, значная частка Беларусі ачышчаны ад нямецкіх захватчыкаў. Радзіме вернуты металургія Поўдня, руда Крыварожжа, Керчы і Нікопаля, пладародныя землі паміж Дняпром і Прутам. З фашысцкага рабства вызвалены дзесяткі мільёнаў совецкіх людзей.

Выконваючы вялікую справу вызвалення роднай зямлі ад фашысцкіх захватчыкаў, Чырвоная Армія вышла да нашых дзяржаўных граніц з Румыніяй і Чэхаславакіяй і прадаўжае цяпер граміць варожыя войскі на тэрыторыі Румыніі.

Поспехі Чырвонай Арміі сталі магчымымі дзякуючы правільнай стратэгіі і тактыцы совецкага камандавання, дзякуючы высокаму маральнаму духу і наступальнаму парыву нашых байцоў і камандзіраў, дзякуючы добраму аснашчэнню нашых войск першакласнай совецкай ваеннай тэхнікай, дзякуючы ўзросшаму майстэрству і вывучцы нашых артылерыстаў, мінамётчыкаў, танкістаў, лётчыкаў, сувязістаў, сапёраў, пехацінцаў, кавалерыстаў, разведчыкаў.

Гэтым поспехам у значнай меры садзейнічалі нашы вялікія саюзнікі, Злучаныя Штаты Амерыкі і Вялікабрытанія, якія трымаюць фронт у Італіі супроць немцаў і адцягваюць ад нас значную частку нямецкіх войск, снабжаюць нас вельмі каштоўнай стратэгічнай сыравінай і ўзбраеннем, падвяргаюць сістэматычнай бамбардыроўцы ваенныя аб'екты Германіі і падрываюць, такім чынам, ваенную магутнасць апошняй.

Але поспехі Чырвонай Арміі маглі-б аказацца нетрывалымі і яны былі-б зведзены на нішто пасля першага-ж сур'ёзнага контрудара з боку праціўніка, калі-б Чырвоную Армію не падпіралі з тыла ўвесь наш совецкі народ, уся наша краіна. Чырвоная Армія ў баях за Радзіму праявіла бяспрыкладнае геройства. Але совецкі народ не застаўся ў даўгу перад Чырвонай Арміяй.

У цяжкіх умовах вайны совецкі народ дабіўся рашаючых поспехаў у справе масавай вытворчасці ўзбраення, огнеприпасаў, абмундзіравання, прадавольства і своечасовай дастаўкі іх на фронты Чырвонай Арміі. За мінулы год сур'ёзна ўзрасла магутнасць совецкай прамысловасці. У строй уступілі сотні новых заводаў, шахт, дзесяткі электрастанцый, чыгуначных ліній, мастоў. Новыя мільёны совецкіх людзей сталі да станкоў, авалодалі складанейшымі прафесіямі, зрабіліся майстрамі сваёй справы. З часцю вытрымалі выпрабаванні вайны нашы калгасы і соўгасы. Не пакладаючы рук, совецкае сялянства ў цяжкіх умовах ваеннага часу працуе на палях, снабжаючы прадавольствам нашу армію і насельніцтва, пастаўляючы сыравіну нашай прамысловасці. А наша інтэлігенцыя ўзбагаціла совецкую навуку і тэхніку, культуру і мастацтва новымі выдатнымі дасягненнямі і вынаходствамі. Неацанімыя заслугі ў справе абароны Айчыны маюць совецкія жанчыны, якія самаадданa працуюць у інтарэсах фронта, мужна пераносяць усе цяжкасці ваеннага часу, натхняюць на ратныя подвігі воінаў Чырвонай Арміі—вызваленцаў нашай Радзімы.

Айчынная вайна паказала, што совецкі народ здолен тварыць цуды і выходзіць пераможцам з самых цяжкіх выпрабаванняў. Рабочыя, калгаснікі, совецкая інтэлігенцыя, увесь совецкі народ поўны рашымасці паскорыць разгром ворага, поўнасцю аднавіць разбураную фашыстамі гаспадарку, зрабіць нашу краіну яшчэ больш моцнай і заможнай.

Пад ударамі Чырвонай Арміі трашчыць і развальваецца блок фашысцкіх дзяржаў. Страх і замяшанне пануюць зараз сярод румынскіх, венгерскіх, фінскіх і балгарскіх „саюзнікаў" Гітлера. Цяпер гэтыя гітлераўскія спадручныя, краіны якіх акупіраваны і акупіруюцца немцамі, не могуць не бачыць, што Германія прайграла вайну. У Румыніі, Венгрыі, Фінляндыі і Балгарыі ёсць толькі адна магчымасць пазбегнуць катастрофы: разрыў з немцамі і выхад з вайны. Аднак, цяжка разлічваць на тое, што сучасныя ўрады гэтых краін здольны парваць з немцамі. Трэба думаць, што народам гэтых краін прыдзецца самім узяць у свае рукі справу свайго вызвалення ад нямецкага іга. І чым хутчэй народы гэтых краін зразумеюць, у які тупік завялі іх гітлераўцы, чым хутчэй спыняць яны ўсякае падтрыманне сваіх нямецкіх парабашчальнікаў і іх спадручных—квіслінгаў у сваёй уласнай краіне, тым менш афяр і разбурэнняў панясуць гэтыя краіны ад вайны, тым больш яны могуць разлічваць на разуменне дэмакратычных краін.

У выніку паспяховага наступлення Чырвоная Армія вышла на нашы дзяржаўныя граніцы на працягу больш 400 кілометраў, вызваліўшы ад нямецка-фашысцкага іга больш трох чвэртак акупіраванай совецкай зямлі. Справа заключаецца зараз у тым, каб ачысціць ад фашысцкіх захватчыкаў УСЮ нашу зямлю і аднавіць дзяржаўныя граніцы Совецкага Саюза ПА ЎСЕЙ ЛІНІІ, ад Чорнага мора да Баранцава мора.

Але нашы задачы не могуць абмяжоўвацца выгнаннем варожых войск з межаў нашай Радзімы. Нямецкія войскі нагадваюць зараз раненага звера, які вымушан адпаўзаць да граніц сваёй бярлогі—Германіі для таго, каб залячыць раны. Але ранены звер, які залез у сваю бярлогу, не перастае быць небяспечным зверам. Каб пазбавіць нашу краіну і саюзныя з намі краіны ад небяспекі заняволення, трэба праследваць раненага нямецкага звера па пятах і дабіць яго ў яго ўласнай бярлозе. Праследуючы-ж ворага, мы павінны вызваліць з нямецкай няволі нашых братоў палякаў, чэхаславакаў і іншыя саюзныя з намі народы Заходняй Еўропы, якія знаходзяцца пад пятой гітлераўскай Германіі.

Зразумела, што гэта задача прадстаўляе больш цяжкую справу, чым выгнанне нямецкіх войск з межаў Совецкага Саюза. Яе мож-

(Працяг гл. на 2 стар.)



# ЗАГАД

## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

(Заканчэнне, пачатак гл. на 1 стар.)

на вырашыць толькі на аснове сумесных намаганняў Совецка- га Саюза, Вялікабрытаніі і Злу- чаных Штатаў Паўночнай Аме- рыкі, шляхам сумесных udараў з Усхода—сіламі нашых войск і з Захада—сіламі войск на- шых саюзнікаў. Не можа быць сумнення, што толькі такі кам- біліраваны ўдар можа поў- насцю сакрушыць гітлераўскую Германію.

Таварышы чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, сержанты, афіцэры і генералы, партызаны і партызанкі! Працоўныя Со- вецкага Саюза! Браты і сёстры, часова падпаўшыя пад іга ня- мецкіх прыгнятальнікаў і сіл- ком угнаныя на фашысцкую катаргу ў Германію! Вітаю і віншую Вас са святам 1 Мая!

ЗАГАДВАЮ:

У чэсць гістарычных перамог Чырвонай Арміі на фронце і ў азнаменаванне вялікіх поспе- хаў рабочых, калгаснікаў і ін- тэлігенцыі Совецкага Саюза ў тылу, сёння, у дзень сусвет- нага свята працоўных у 20 га- дзін правесці салют у Маскве, Ленінградзе, Гомелі, Кіеве, Харкаве, Растове, Тбілісі, Сім- феропалі, Одэсе — дваццацю артылерыйскімі залпамі.

Няхай жыве наша Совецкая Айчына!

Няхай жыве наша Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот!

Няхай жыве Вялікі Совецкі народ!

Няхай жыве дружба наро- даў Совецкага Саюза!

Няхай жывуць совецкія пар- тызаны і партызанкі!

Вечная слава героям, паў- шым у баях за свабоду і неза- лежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захватчы- кам!

*Вярхоўны Галоўнакамандуючы*
*Маршал Совецкага Саюза*
*І. СТАЛІН.*




Адважныя партызаны і партызанкі! Усямерна ўзмацняйце дапамогу наступаючай Чырвонай Арміі, граміце тылы і штабы ворага, зрывайце перакідку нямецкіх рэзерваў да фронта, выратоўвайце совецкіх людзей ад знішчэння і угону іх на катаргу ў Германію, бязлітасна знішчайце нямецка-фашысцкіх ізвергаў! Няхай жывуць слаўныя совецкія партызаны і партызанкі!

## Сваімі сіламі

Даць больш будаўнічага лесаматэрыялу для аднаўлення разбураных немцамі вёсак і гарадоў—такое адзінае жаданне калектыва работнікаў леспрамгаса вызваленай Полаччыны.

Атрымаўшы заданне загатовіць 3.600 кубаметраў будаўнічага лесаматэрыялу для новабудоўляў, дырэктар леспрамгаса тав. Журыдаў М. А. мабілізаваў увесь свой апарат на выкананне важнага задання.

Сам тав. Журыдаў—кваліфікаваны майстар стаханаўскіх метадаў загатоўкі лесу лучковай пілой і гэтаму майстэрству ён абучыў многіх сваіх лесарубаў.

Па 18 і больш кубаметраў лесаматэрыялу ў дзень —замест 4 па норме—выпрацоўваў сваёй лучковай пілой тав. Журыдаў. Яго прыкладу следвалі і астатнія, выконваючы дзённае заданне на 200-250 процантаў.

РАБІКАЎ.

## Рахунак акупантам

Спачатку Айчыннай вайны і па 1 сакавіка 1944 года партызанамі Віцебскай вобласці спушчана пад адкос 1.147 чыгуначных эшалонаў праціўніка, узарвана 6 бронепаяздоў, разбіта 748 паравозаў, 9.955 вагонаў, платформ і цыстэрн, узарваны 39.264 рэльсы, разбурана 262 кілометры чыгуначнага палатна, знята і пашкоджана 505 кілометраў тэлефонна-тэлеграфнай лініі, узарвана і спалена 970 шасейных і чыгуначных мастоў.

Партызаны Віцебшчыны разграмілі 7 нямецкіх штабаў, 165 воінскіх гарнізонаў і валасных упраў, знішчылі 77 самалётаў праціўніка. На партызанскіх мінах узарвана 151 бронемашына, танк і танкетка, узарваны і спалены 3.643 аўтамашыны і матацыклы. Грозныя народныя мсціўцы знішчылі 7 вышэйшых чыноў праціўніка і 97 420 нямецкіх салдат і афіцэраў. Больш 27 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў ранена і каля 700 чалавек узята ў палон.

Гэты рахунак з кожным днём усё больш павышаецца. Няма межаў грознаму народнаму гневу, які з кожным днём усё больш абрушваецца на галовы чорнай фашысцкай гадзіны і хутка спапяліць і змяце з твару зямлі фашысцкую погань.

## Совецкія дзеці не будуць сіротамі

914 дзяцей-сірот вызваленых раёнаў нашай вобласці знайшлі сабе прытулак у дзіцячых дамах, школах ФЗА. Многія з іх усыноўлены і ўстроены на работу. На палепшанне быта дзяцей-сірот, працоўныя вобласці аддалі свае зберажэнні ў суме 30.970 руб.

## З багатымі трафеямі

Калі немцы буйнымі сіламі прасоўваліся лесам, каб напасці на партызан, партызанскі атрад імені Сімацкага пайшоў насустрач праціўніку і ў кустах зрабіў засаду. Камандзір атрада тав. К. з 35 аўтаматчыкамі зайшоў гітлераўцам у тыл і нечакана напаў на варожыя аўтамашыны.

У кароткай схватцы партызаны разграмілі і спалілі 4 грузавых, 2 легкавых нямецкіх аўтамашыны.

Народныя мсціўцы захвацілі важныя штабныя дакументы, многа боепрыпасаў і прадавольства, забілі 35 варожых салдат, аднаго афіцэра і многа ранілі.

У гэтым баю комуніст Васілій А. гранатай знішчыў гітлераўскага кулямётчыка і захваціў нямецкі ручны кулямёт. Член партыі тав. К. агнём з аўтамата знішчыў варожы артылерыйскі разлік і двума супроцьтанкавымі гранатамі ўзарваў нямецкую 75-міліметровую гармату.

Е. ЛУКАШЭНКА.

## Загад быў выканан

Шлях да чыгункі быў вельмі цяжкі, бо немцы ўзмацнілі ахову і замініравалі ўсе падыходы да чыгуначнага палатна. Але нішто не магло служыць перашкодай да выканання загада камандавання партызанскай брыгады таварыша К.

Трэба было вывесці са строю чыгунку, а для гэтага—на значным участку пуці ўзарваць рэльсы.

На выкананне баявога задання пайшлі партызаны атрада пад кіраўніцтвам свайго камісара таварыша С. Не гледзячы на тое, што многія байцы не адпачывалі ўжо па двое і трое сутак, усе ішлі бадзёра і былі ўпэўнены, што пераможуць усе перашкоды.

Старанна і ўмела правёўшы разведку, партызаны незаўважанымі падышлі да самай чыгункі. Хутка былі закладзены некалькі прынесеных мін і адразу-ж пачуліся выбухі, якія суправаджаліся віскам рваўшыхся рэльсаў.

Немцы пачалі абстрэльваць чыгуначнае палатно і шляхі адыходу. Партызаны пайшлі на хітрасць. Адцягваючы ўвагу праціўніка, флангавая ахова партызан завязала з немцамі перастрэлку, а падрыўнікі пад прыкрыццём гэтага агню прадаўжалі сваю работу. Загад камандавання быў выканан з чэсцю. 218 рэльсаў узляцелі ў паветра.

За сакавік месяц партызанамі брыгады ўзарвана 680 рэльсаў, падбіта з ПТР 29 паравозаў, узарваны 2 аўтадрэзіны і 21 аўтамашына. Спушчан пад адкос воінскі эшалон, разбіта 13 вагонаў з жывой сілай і тэхнікай праціўніка. За гэты-ж месяц знішчана 410 гітлераўцаў.

А. ПАРХІМЧЫК.

## У ТЫЛУ ВОРАГА



У партызан заходніх абласцей Беларусі.

НА ЗДЫМКУ: Партызаны атрада імені Варашылава мініруюць мост.

*Калгаснікі і калгасніцы, аграномы, рабочыя і работніцы МТС і соўгасаў! Узорна правядзем веснавую сяўбу, забяспечым высокую агратэхніку ў калгасах і соўгасах! Даб'емся высокай ураджайнасці, павялічым валавы збор зернавых і другіх сельскагаспадарчых культур! Дадзім больш прадавольства фронту і краіне, больш сыравіны— прамысловасці. Няхай жыве савецкае сялянства!*

## Высокаякасна правядзем сяўбу

Правільная арганізацыя працы ў брыгадзе—верны спадарожнік паспяховага вырашэння ўсіх гаспадарчых задач калгаса. Улічваючы гэта, я расставіў свае сілы так:

У брыгадзе створаны 4 звяны. Звеннявымі падабраны самыя ініцыятыўныя і вопытныя калгаснікі. За звеннямі замацаваны ўчасткі. Распланіравана чаргаванне культур па папярэдніках. Замацавана цягла, сельгасінвентар, збруя і транспартныя сродкі. Да звенняў мы давялі план ураджайнасці, разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва за пяршынства ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, за ўзорнае яе правядзенне.

Звеннявая арганізацыя працы ўжо ў самой падрыхтоўцы да веснавых работ дала станоўчыя вынікі. Брыгада забяспечыла сябе неабходнай колькасцю насення, якое старанна адсартыравана і праверана на ўсхожасць. Вывезена на палі да 100 тон гною і сабрана 12 цэнтнераў попелу для падкормкі пасеваў ільну. Праведзен рамонт сельгасінвентара і збруі.

Праўленне калгаса зацвердзіла для брыгады вытворчы план, нормы выпрацоўкі і высева, план агратэхнічных мерапрыемстваў і распарадак дня, якія мы шырока абмеркавалі на агульным калгасным сходзе, а таксама на сходзе брыгады і па звеннях.

Веснавую сяўбу гэтага года мы правядзем у сціслыя тэрміны і на высокім агратэхнічным узроўні. Парукай гэтаму з'яўляецца небывалы працоўны ўздым калгаснікаў, іх гарачае імкненне атрымаць высокі ўраджай, даць краіне і фронту больш хлеба.

БУКОЎСКІ,
брыгадзір калгаса
„Пражэктар“.

## УЗАРАЛІ 89 ГЕКТАРАЎ

ЛЁЗНА. (Па тэлефону). Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай, перадавыя калгасы Лёзненшчыны сустракаюць Першае Мая дружным разгортваннем палявых работ на вызваленай роднай зямлі.

Зараз ужо 46 калгасаў раёна вядуць выбарачнае веснавое ворыва. Паднята 89 гектараў.

Перадавыя калгасы прыступілі да сяўбы ранніх зернавых. Ужо засеяна 6 гектараў.



НА ЗДЫМКУ: Старшыня калгаса імені Карла Маркса, Варашылаўскага сельсовета, Бегавацкага раёна, УЗССР Мумінаў Рахмаджан запісвае выкананне норм школьнікам.

## На палях вызваленых калгасаў

### ПЕРШЫЯ ГЕКТАРЫ

З велізарным працоўным уздымам калгаснікі вызваленых калгасаў Сіроцінскага раёна прыступаюць да вясенне-палявых работ. Першымі распачалі ворыва сельгасарцелі імені Сталіна (старшыня Пятрушэнка) і "Чырвоны Май“ (старшыня Казлоў). За тры дні ў абодвух калгасах уручную і на конях паднята 20 гектараў.

СЦЕФАНОВІЧ.

### ПАЧАЛІ СЯЎБУ РАННІХ ЯРАВЫХ

СУРАЖ. 20 калгасаў раёна вядуць выбарачныя палявыя работы. Калгасы імені Варашылава, „Звязда“, „Вольная Праца“, імені Сталіна і „Першага Мая“ прыступілі да сяўбы ранніх яравых. Усяго пасеяна 7 гектараў.

## Патрыятычны ўздым

У калгасах Суражскага раёна адбываюцца сходы, прысвечаныя вынікам работы VI сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. З вялікім задавальненнем калгаснікі сустракаюць рашэнні Сесіі.

Адбыўся сход у калгасе „Прамысловая Праца“ Янавіцкага сельсовета. Даклад аб выніках работы VI Сесіі Вярхоўнага Совета БССР зрабіў загадчык сельгасаддзелам абкома партыі т. Ліксо. Рашэнні Сесіі калгаснікамі сустрэнуты з вялікім вытворчым уздымам у правядзенні веснавой сяўбы.

Калгаснік Пятро Сонаў на сходзе заявіў:

—Я ўношу звыш плана ў насенны фонд калгаса 24 кілограмы зярна і заклікаю калгаснікаў паследваць майму прыкладу. Няхай звышпланавае насенне, пасеянае на нашых палях, з'явіцца дапамогай нашай вызваліцельніцы Чырвонай Арміі ў канчатковым разгроме ворага. Тут-жа на сходзе 12 калгаснікаў заявілі, што ўносяць звыш плана па пуду зярна ў насенны фонд калгаса.

У адказ на рашэнні Сесіі, калгаснікі сельгасарцелі „Чэлюскінец“ павышаюць сваю працоўную актыўнасць. Калгас арганізавана прыступіў да веснавой сяўбы.

М. ШЭНДЗЕЛЕЎ.



Адступаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, гітлераўцы дашчэнту разбурылі станцыю Лёзна. Жыхары горада Лёзна актыўна ўзяліся за аднаўленне разбуранай станцыі.

НА ЗДЫМКУ: група гаражан за падрыхтоўкай пляцоўкі для будынка вакзала. На пярэднім плане: Анна Тімафееўна Дабракова, якая выконвае норму на 200—300 процантаў.

# ЗНОЎ ВОЛЬНЫ МАЙ

Да вайны наш калгас заўсёды быў у ліку перадавых. Густымі хлябамі каласавалася наша калгаснае поле. Багатым быў калгас і заможна жылі калгаснікі. Вага аднаго працадня складала тры кілограмы зернавых і 5—10 кілограмаў бульбы. У поўным дастатку і радасці адзначалася заўсёды вялікае свята — 1 Мая.

Але ўсё нарушыў ненавісны вораг. Дзве гадавіны Мая знаходзіліся мы ў фашысцкай няволі. Нямецкія вандалы разбуралі наш калгас, рабавалі калгаснікаў. Не жылі мы, а пакутвалі. Гітлераўскія каты павесілі маю маці і двух сясцёр, загубілі многа другіх ні ў чым непавінных калгаснікаў.

Гераічная Чырвоная Армія вызваліла нас ад жудаснага кашмару.

Першае Мая ў гэтым годзе калгаснікі нашай сельгасарцелі сустракаюць вольнымі, на сваёй роднай вызваленай зямлі. У дзень гэтага вялікага свята кожнаму з нас хочацца выказаць за вызваленне наша вялікае дзякуй Чырвонай Арміі, геніяльнаму палкаводцу і правадыру народаў таварышу Сталіну.

Да вайны да Першага Мая наш калгас заўсёды прыходзіў з добрымі паказчыкамі ў рабоце. Як ні цяжка, але і сёлета, мы прышлі да свята з поўным завяршэннем падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, першай сяўбы на вызваленай зямлі.

Як толькі Чырвоная Армія вызваліла нас, мы дружна ўзяліся за аднаўленне роднага калгаса. Абрана праўленне, брыгадзірамі назначаны калгасніцы Вера Емельянкіна і Моця Пчолкіна. Створаны звенні.

Нядаўна на агульным сходзе мы дэтальна абмеркавалі план веснавой сяўбы. Кожны брыгадзір зараз ведае свае ўчасткі. Мы ў гэту вясну засеем 82 гектары зернавымі, пасеем лён. Пасадзім 22 гектары бульбы. Пад кожную культуру мы падабралі лепшыя папярэднікі.

Насення калгаснікі сабралі на ўсю плошчу яравога кліна. За гэта наш калгас занесен на раённую Дошку гонару. Сабрана насенне гародніх культур на 2 гектары.

Праводзячы вольна Першае Мая, нашы калгаснікі поўны жадання прыкласці ўсе свае сілы к таму, каб паспяхова правесці веснавую сяўбу, заваяваць высокі ўраджай, даць сваёй вызваліцельніцы Чырвонай Арміі і краіне больш хлеба.

С. ПЧОЛКІНА,
старшыня калгаса „Сігнал“.



Звеннявая звяна высокай ураджайнасці Надзежда Пятроўна Багданава (калгас імені Куйбышэва) Юргінскага раёна, Кемераўскай вобласці, атрымала ў 1943 г. высокі ўраджай табакі—136 цэнтнераў з гектара. Яна ўзнагароджана ордэнам Леніна.

У 1944 г. звяно Н. П. Багданавай абавязалася сабраць 150 цэнтнераў табакі з гектара.

